
Да вытокаў
духоўнасці



Паважаны чытач!
Запрашаем цябе на віртуальную выставу, на якой ты зможаш пазнаёміцца з цікавымі кнігамі, якія паведаюць пра гісторыю беларускай культуры, святах, абрадах і традыцыях беларускага народа.
Цікавага прагляду!

У энцыклапедычным даведніку прапануецца асноўная даведачная інфармацыя па гісторыі і тэорыі беларускай народнай культуры, фальклорна-абрадавых традыцыях і святах, міфалогіі, народным мастацтве, традыцыйных адзенні і жіллі, нацыянальнай кухні, аграрнай гаспадарцы, промыслах і рамёствах і інш. Выданне багата ілюстравана каляровымі і чорна-белымі здымкамі, малюнкамі і чарцяжамі.

Кніга адрасавана навучэнцам і выкладчыкам, навукоўцам і ўсім тым, хто цікавіцца айчыннай гісторыяй і культурай.




**Народная культура Беларусі : энцыкл. давед. / пад агул. рэд. В. С. Цітова ; маст. : І. І. Бокі, У. М. Жук. — Мінск : БелЭн, 2002. — 432 с. : іл.**

Книга посвящена рассмотрению правил-регламентаций каждого дня года и наиболее значимых календарных праздников, а также запретов, предписаний и правил поведения человека, семьи, рода и всего социума, связанных с подготовкой и проведением обрядов семейно-родовой напрвленности – рождения, крестин, свадьбы.

Книга расчитана на преподавателей гуманитарных дисциплин вузов, фольклористов, работников сферы образования и культуры, всех почитателей  традиционного нематериально-культурного наследия восточнославянских народов.




**Котович О. Золотые правила народной культуры / О. Котович, Я. Крук. — 2-изд. испр. и доп. — Минск : Адукацыя і выхаванне, 2008. — 592. : ил.**

Том прысвечаны навуковаму аналізу праблем паходжання і этнічнага развіцця беларускага народа, яго вытокаў, каранёў, змен, якія адбываліся ў яго культуры на працягу стагоддзяў. Высвятляюцца этнічныя асаблівасці беларускага народа, яго культурныя сувязі з іншымі народамі, сучасны стан і шляхі далейшага развіцця.

Разлічаны том на этнолагаў, гісторыкаў, мастацтвазнаўцаў і шырокае кола чытачоў.




**Беларусы. Т 4. Вытокі і этнічнае развіццё / В. К. Бандарчык, В. М. Бялявіна, Г. І. Каспяровіч і нш. ; рэдкал. : В. К. Бандарчык і інш. ; Ін-тмастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. — Мінск : Бел. Навука, 2001. — 433 с. : іл.**




Разглядаюцца праблемы бытавання, асаблівасці і характар развіцця важнейшай галіны сучаснай мастацкай культуры Беларусі — народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, традыцыйных мастацкіх рамёстваў і промыслаў.

Кніга прызначаецца ўсім, каго цікавіць традыцыйная мастацкая культура Беларусі.

**Сахута Я. М. Сучаснае народнае мастацтва Беларусі / Я. М. Сахута. — Мінск : Беларусь, 2013. — 255 с. : іл.**




Альбом складаецца з пяці раздзелаў, што маляўніча і змястоўна знаёмяць чытача з перлінамі гісторыі, народнага мастацтва, архітэктуры, прыроды і сталіцай Мінскам.

**Беларусь = Belarus : гісторыя, народнае мастацтва, архітэктура, прырода, Мінск / [аўтар-складальнік, мастак Д. Раманюк ; пераклад Г. Скакун ; рэдактар беларускага тэксту Г. Рабянкова ; фота : В. Бараноўскі і інш.]. — Мінск : Дзяніс Раманюк, 2013. — 47, [1] с.**

У альбоме прадстаўлена каля 100 прафесійных мастакоў розных пакаленняў, якія працуюць у вобласці манументальнага мастацтва, а таксама пошукі новых мастацкіх вобразаў, пластыкі мовы, аўтарскага стылю маладымі спецыялістамі. У альбоме сабраны бяграфічныя звесткі, персанальныя сайты і электронныя адрасы мастакоў, якія увайшлі ў выданне. Кніга разлічана на шырокае кола чытачоў.




**Сучаснае беларускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. XXI стагоддзе = Современное белорусское декоративно-прикладное искусство = Modern Belarusian arts and craft. XXI century : альбом / аўт. Тэксту, склад., пер. на беларус. Мову : К. С. Аксёнава ; аўт. уступ. арт. Н. В. Шаранговіч. — Мінск : Беларус. Энцыкл. Імя П. Броўкі, 2013. — 400 с. : іл.**




Художественный альбом знакомит с коллекцией экспонатов Музея древнебелорусской культуры. Разделы альбома: Живопись, Скульптура и Резьба, Художественная обработка металлов, Художественные ткани, Белорусский народный костюм, Рушники, Археология и истоки искусства, Керамика, Предметы народного быта. Книга расчитана на широкий круг читателей.

**Музей старажытнабеларускай культуры : [альбом] / уклад. А. А. Ярашэвіч. — Мінск : Беларусь, 2004. — 284 с.**




Автор книги А. Ф. Роголев, много лет изучающий топонимию Беларуси, считает, что в названиях тех или иных мест и связанных с ними легендах и преданиях может содержаться скрытая (эзотерическая) информация, которую невозможно понять в полной мере, применяя только традиционные методы исследования.

Увлекательное повествование не оставит равнодушными всех тех, кто интересуется загадками и тайнами как родной истории, так и самой природы.

**Рогалев А. Ф. Скрытый смысл географических названий, легенд и преданий (на материале Беларуси) / А. Ф. Рогалев. — Гомель : Барк, 2012. — 203 с.**




На русском и английском языках кратко описаны история, природа, архитектура, культура, спорт, национальная кухня Беларуси. Текст сопровождается многочисленными красочными иллюстрациями. Книга предназначена для широкого круга читателей.

**Беларусь приглашает / фото : А. П. Дрибас, А. В. Клещук, А. И. Лосминский. — Минск : Беларусь, 2017. — 71 с.**




У альбоме прадстаўлены фотаздымкі беларускай прыроды, гістарычных помнікаў весак і гарадоў.

Кніга разлічана на шырокае кола чытачоў.

**Беларусь = Belarus : [альбом] / склад. Г. І. Мацур. — Минск : Беларусь, 1995. — 172 с.**




Энцыклапедычны даведнік прысвечаны царкоўнаму дойлідству з часоў старажытнасці да нашых дзён. У ім змешчана інфармацыя пра вядомыя помнікі – цэрквы, манастыры, капліцы, якія ўвайшлі ў скарбніцу сусветнай архітэктуры, малавядомыя помнікі і тыя, якія не дайшлі да нас па розных прычынах.

**Кулагін А. М. Праваслаўныя храмы на Беларусі : энцыкл. даведнік / А. М. Кулагін; маст. І. І. Бокі. — Мінск : БелЭн, 2001. — 328 с. : іл.**

Энцыклапедычны даведнік прысвечаны касцёльнаму дойлідству з часоў старажытнасці да нашых дзён. У ім змешчана інфармацыя пра вядомыя помнікі – касцёлы, якія ўвайшлі ў скарбніцу сусветнай архітэктуры, малавядомыя помнікі і тыя, якія не дайшлі да нас па розных прычынах.




**Кулагін А. М. Каталіцкія храмы на Беларусі : энцыкл. Даведнік / А. М. Кулагін ; мас. І. І. Бокі. — 2-е выд. — Мінск : БелЭн, 2001. — 216 с. : іл.**

# Народныя беларускія святы

Для кожнага чалавека Радзіма пачынаецца з тога месца, дзе ён нарадзіўся і вырас, дзе ён жыве і працуе побач са сваімі блізкімі. Кожны павінен любіць свой край, бо чалавек, які любіць зямлю, на якой жыве, нарадзіўся, робіцца моцным і мудрым.

У нашых продкаў было шмат свят, звязаных з важнымі падзеямі ў жыцці чалавека. Яны паўтараліся з году ў год і былі падпарадкаваны гадавому вітку Зямлі вакол Сонца, якое давала веснавы росквіт прыродзе і замарожвала яго надоўга восенню, каб адрадзіць наступнай вясной. Так утварылася кола свят і абрадаў беларускага народа. Прапаную разам вырушыць ў падарожжа па колу свят!




КАЛЯДЫ
МАСЛЕНКА
ВЯЛІКДЗЕНЬ
СЁМУХА
КУПАЛЛЕ
ЖНІВО
БАГАЧ
ДЗЯДЫ

# Каляды

***Калі на Каляды прыгравае, быць зялёнаму году.***





Калядныя святы пачыналіся з дня Божага Нараджэння — Раства. Калі першая зорка з’яўлялася на небе, уся сям’я садзілася за стол, засланы белым абрусам, пад які клалі сена. Стравы на стале былі посныя, абавязкова варылі куццю — кашу з круп. Запаліўшы свечку і памаліўшыся, пачыналі вячэраць. З гэтага дня па сяле хадзілі калядоўшчыкі — юнакі і дзяўчаты, пераапранутыя ў цыганоў, казу, жорава, кабылу. Калядоўшчыкі спявалі песні-калядкі, скакалі пад скрыпачку і бубен, у заключэнне выконвалі велічальную песню гаспадарам дома з самымі шчодрымі пажаданнямі, а ў адказ атрымлівалі пачастункі.

# Грамніцы, альбо Стрэчанне

***Грамніцы — палавіна зіміцы.***

Свята сустрэчы зімы і лета. Якое надвор’е на Грамніцы, такая будзе і вясна. Пасля гэтага дня пачыналі рыхтавацца да работ у полі. У царкве ці касцёле асвячалі грамнічныя свечкі. Яны лічыліся ахоўнымі — гаспадар з дапамогай гэтых свечак «асвячаў» хату і ўсю гаспадарку, выпальваючы імі невялікія крыжыкі на дзвярах і варотах. Верылі, што грамнічныя свечкі ратуюць будовы ад удару маланкі. З грамнічнымі свечкамі тройчы абыходзілі свойскую жывёлу на свята Юр'я, іх запальвалі на засеўкі, з імі абыходзілі хаты на Іллю і Багача, сустракалі маладых на вяселлі, дзіцятка на радзінах, клалі ў руку нябожчыку, ішлі шукаць папараць-кветку на Купалле.



# Сырны тыдзень, або Масленка

***Масленка, масленка, нясі сыру, масла нам, каб зімачка згасла!***

Старажытнае язычніцкае свята. У гэты тыдзень праводзяць зіму. Сёння Сырны тыдзень болей вядомы як Масленка. Шмат стагоддзяў у беларусаў сыр быў самым папулярным прадуктам і сімвалізаваў нараджэнне новага жыцця. У гэты тыдзень дзяўчаты і хлопцы ладзілі гушканне на арэлях, коўзанне з горак на санках. Верылі, што чым вышэй узляціш на арэлях, чым далей скоцішся з горкі — тым даўжэйшы будзе лён. На Масленку ласуюцца блінамі, спяваюць масленічныя песні.





# Гуканне вясны

***Благаславі, Божа, вясну заклікаці, лета сустракаці!***

Першае вясновае свята. Дзяўчаты збіраліся на ўзгорках (каб было бліжэй да неба) і спявалі вяснянкі — песні, у якіх клікалі вясну. Вадзілі карагоды, спальвалі пудзіла зімы, як на Масленку. Падчас спеваў вяснянак і гукальных карагодаў дзяўчаты падкідвалі ўверх печыва ў выглядзе птушак — жаўрукоў, кулікоў, буслоў, што павінна было, як і спевы, хутчэй выклікаць надыход вясны.





# Вялікдзень

Гэтае свята лічыцца найвялікшым каляндарным святам. Яно складае выключную адметнасць, самабытнасць беларускага абрадава-святочнага каляндара. На гэта свята сутракалі Новы Год па сонечнаму календару. Святкавалася ў дзень вяснавога раўнадзенства. Потым стала перасоўным ад 4 красавіка да 8 мая. Апошняя нядзеля перад святам была Вербная нядзеля. У царкву заносілі галінкі вярбы, якія асвяшчалі святой вадой. Потым прынасілі дамоў і з'ядалі па аднаму пухірку, каб абараніцца ад маланкі, а рэшткі вярбы захоўвалі да наступнай Вербніцы.





# Наўскі Вялікдзень




Адзначаўся ў чысты чацвер, як частка агульнакаляндарнай традыцыі ўшанавання дзядоў. Гэтае свята больш вядома пад назвай Радауніца (*Ра́даніца*, *Ра́дуніца*, *Радаўні́цкія Дзяды́*, *На́ві Дзень*) – дзень памінаньня памерлых ва ўсходніх славянаў, на які са старажытных часоў адбываліся трапэзы на магілах бацькоў і блізкіх сваякоў. Назва *Наві Дзень* паходзіць ад старажытна-славянскага *навь* – нябожчык.

Праваслаўная Царква ўключыла Радаўніцу ў свой культ.

Радаўніца адзначаецца праз тыдзень пасля Вялікадня, заўжды на аўторак. Спачатку ідуць памінаць блізкіх у царкву, а потым на могілкі. І хоць існуе звычай памінальнай трапэзы, у тым ліку веліконднае яйка пакідаць «для спачылых», Праваслаўная Царква не ўхваляе гэтага звычаю, паколькі лічыцца, што памерлым патрэбна толькі малітва аб упакаеньні душы і добрыя справы ў памяць пра іх.

# Зялёныя святкі або Сёмуха

Свята найвышэйшага росквіту прыроды. Вядома пад назвай Сёмухі, Тройцы. Святкуецца гэтае свята на сёмым і восьмым тыдні пасля Вялікадня. Гэтае свята з'яўляецца гімнам маці-прыродзе, сімвалізуе ўласцівае канцу вясны і пачатку лета ўшанаванне зеляніны, дрэў і кветак, што знаходзяцца ў сваім росквіце. Яны – прыроднае атачэнне свята, яго вобразнасць і змест.



Некалі даўно маладыя дзяўчаты з песнямі хадзілі ў лес. Абіралі там маладыя бярозкі і завівалі паміж сабой стужачкамі, каб атрымаліся такія ўпрыгожаныя вароцікі. Пасля праз іх праходзілі. Даследчыкі кажуць, што гэта такі архаічны сімвал таго, што жанчына ўступае ў шлюбны ўзрост і тым яднаецца з прыродай, паказвае сусвету, што яна ўжо гатовая пайсці замуж і нараджаць дзетак.



# Купалле

У разгар лета ў Беларусі адзначаюць Купалле – адно з найстарадаўнейшых народных свят, прысвечаных сонцу і росквіту зямлі. Гэтае свята насычана прыгожымі язычніцкімі звычаямі. Сутнасць гэтага свята засталася некранутай да нашых дзён. Увасабленнем былі ачышчальныя вогнішчы, ачалавечаны вобраз жанчыны Купалы і нават яго дочкі. Сёння згодна з праваслаўным каляндаром свята адзначаюць у ноч з 6 на 7 ліпеня, каталіцкім – 24 чэрвеня.

З Купаллем звязана шмат дзіўных легенд і паданняў. У народзе верылі, што ў гэту ноч рэкі свецяцца асаблівым нерэальным святлом, а ў іх водах купаюцца душы памерлых у абліччы русалак. Па зямлі ходзяць ведзьмы, чарадзеі і духі, якія імкнуцца нашкодзіць чалавеку, расліны і жывёлы размаўляюць, а сонца на золку "гуляе".

Убачыць гэтыя цуды, зразумець мову звяроў і птушак можна з дапамогай кветкі папараці, якая зацвітае, згодна з павер'ямі, усяго на імгненне раз у год. Яна давала незвычайную здольнасць бачыць будучыню і знаходзіць усе схаваныя скарбы свету, але раздабыць яе мог толькі вельмі смелы чалавек. Пошук "папараць-кветкі" – адзін з самых таямнічых рытуалаў купальскай ночы.





# Пакровы



Пакроў (Пакравы, Пакрова): 1 (14) кастрычніка — царкоўнае тлумачэнне літаральнае: пакроў (пакрывала) Божай Маці; у народнай трактоўцы паняцце атрымала больш шырокі сэнс, ахопліваючы самыя розныя прыкметы прыроды: «*Святы Пакроў накрыў зямлю жоўтым лістом, маладым сняжком, ваду лёдам, пчалу мёдам*», «*...рыбу луской, дрэва карой, птаху пяром, дзеўку чапцом*»; «*Святэй Пакроў стагі пакрыў: першы стажок дранічкамі, другі стажок саломкаю, трэці стажок белым снегам*». Гаварылі, што зіма закрывае лета, а Бог пячатае зямлю пасля Пакрова, і да вясны ніхто не можа знайсці скарбаў. Адзначаліся ад 14 кастрычніка да 27 кастрычніка. На гэтае свята размярковываліся дні паміж дзяўчатамі, а 27 кастрычніка па надвор'ю меркавалі аб характары будучай жонкі, і называлі гэты час Дзівочым летам. Пачынаючы з гэтага свята, моладзь пачынала збірацца на вячоркі, а хатнія справы спраўляліся з песнямі.

# Зімовыя святкі





Зімовыя святкі пачыналіся пасля постнай куцці (6 студзеня) і завяршаліся да Вадахрышча (19 студзеня). На гэтае свята адбываліся сапраўдныя тэатралізаваныя беларускія народныя карнавалы. Пачыналіся зімовыя святкі з Каляд (7 студзеня), якія былі ў гонар зімоваго сонцазвароту і каляднага месаеду пасля Пілiпаўскага посту. На гэты язычніцкі абрад наслаівалася хрысціянскае свята нараджэнне Хрыстова – свята Раства. Неад'емным рытуалам з'яўляецца ўшанаванне продкаў-дзядоў. Гэтаму прысвячалі тры ўрачыста-шанавальныя куцці: перадкалядная посная, багатая – шчодрая і вадзяная. Гэтая дзея цягнулася ад 25 снежня да 6 студзеня.

# Дзякуй за ўвагу!